Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес —2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей,, хто нэ захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 28 Жніўня 1914 г. № 34

Друкуецца і скора выйдзе

**„БЕЛАРУСКІ КАЛЕНДАР"**

**на 1915 год.**

Календар друкуецца двумя асобнымі выданьнямі: рускімі і лацінскімі літэрамі, з іншым у кожным тэкстам.

Заказы на календар трэба прысылаць загадзе у „Беларускую Кнігарню"

Вільня, Завальная № 7.

## Першы месяц вайны.

Мінуў ужо месяц з лішнім гэтэй як сьвет-сьветам найвялікшай агульна-эўропэйскай вайны. Што яна людзям прынесла, хто каго да гэтаго часу змог, калі скончыцца—вось тые пытаньня, якіе цяпер кожнаму насовываюцца на думку. Прынесла вайна мала чаго вясёлаго, хіба толькі тое, што людзі добра ей глянулі у вочы і добра пазналі, што гэта такое агульна людзкае нешчасьце, якое, каб не варочалося ніколі.

Хто каго з ваякаў змог—гэта разгледзім па парадку. Пачался ваенная заверуха ад Аўстрыі і Сэрбіі. Як ведама, Сэрбія ня выпаўніла жаданьняў Аўстрыі і гэта апошняя абвесьціла ей вайну. Спачатку перэвага была якбы на старане Аўстрыі, але пасьля сэрбы звярнуліся і атпёрлі аўстрыякоў з вялікімі для іх стратамі. Апошнімі днямі аўстрыякі час ад часу абстрэліваюць толькі усё ешчэ Бэльград і на гэтым якбы іх вайна с сэрбамі далей і не пасоваецца.

Нямеччына, абвесьціўшы вайну чуць не адначасьне Расеі, Бэльгіі і Франціі, намылілася троху у сваіх плянах. Думала яна хутка перакінуць цераз Бэльгію войска у Францію разграміць яе і тады ўсімі сіламі рынуцца на Расею. Гэта ей не ўдалося. Дзякуючы моцнаму і геройскаму супраціўленьню бэльгійцаў, немцы шмат часу і войска патрацілі, пакуль не змаглі гэтай старонкі, а за гэты час расейцы і французы як сьлед прыгатаваліся да вайны. У часе змаганьня з Бэльгіей, немцы былі змушэны весьці бітвы с Франціей і Расеей. С пачатку палажэньне было не выразнае, але пад канец высьветлілося. Немцы амаль ня саўсім заваевалі Бэльгію, а с французамі ідзе ў іх бітва с пераменным шчасьцем, хоць ўсё-ж такі, трэба прызнацца, што французкае войска пад напорам большых сіл нямецкіх і с поглядоў тактыкі ваеннай атступае у глыб свайго краю, і цяпер чуць не каля самаго Парыжу ідзе ваеннае змаганьне. Поруч з бітвамі у Бэльгіі і Франціі немцы перайшлі былі у некаторых мейсцах расейскую граніцу у Польшчы, але не надоўга. Расейская армія рушылася у свой чарод у Прусію (Ўсходнюю) заняла з бою шмат гарадоў і некалькі важных у ваенным дзеле пунктоў, ды змусіла такім парадкам немцоў пакінуць занятые польскіе гарады. Апошнімі днямі нічога такога важнаго паміж немцамі і расейцамі не чуваць. Адбываюцца толькі не вялікіе стычкі.

Услед за Нямеччынай абвесьціла вайну Расеі і Аўстрыя. Тут так сама с пачатку аўстрыякі перайшлі у некатарых мейсцох расейскую граніцу, але ізноў-жэ не надоўга. Расейскае войска перайшло аўстрыяцкую граніцу і вядучы с праціўнікам праз колькі дзён заўзятые бітвы, змагла яго і заняла Львоў і Галіч, самые важные пункты у Галіччыне. Аўстрыякі атступілі з агромнымі стратамі у людзях, аружжы і інш. І цяперака пакідаюць занятые у Расеі мейсцы.

Умешалася у гэту вайну і Англія. Перакінула яна на французкую граніцу у помач французам каля 150 тысяч свайго войска, але у цяперашнюю вайну гэткая армія мала што можэ зрабіць. За тое на моры англічане чуць не саўсім запанавалі. Нямецкі флот нікуды ня можэ рушыцца, а ў некаторых стрэчах з ангельскім пацярпеў немалые шкоды.

Чэрнагорыя так сама задзёрлася з Аўстрыей, але значнай перэвагі на тую ці другую старану не чуваць.

Вайна Японіі з Немцамі за высну Кіао-Чао пакульшто—на пачатку і вельмі важнаго значэньня не мае, адно толькі што флот японскі узмацуе марскіе сілы праціўнікоў Нямеччыны.

Другіе эўропэйскіе дзержавы, не ўцягнутые ешчэ у вайну, дружна к ёй прыгатаўляюцца, як напрыклад Турція і Італія.

З усей гэтай вайны хіба найбольш пакульшто уцярпела Бэльгія і Аўстрыя: першую саўсім немцы разбілі, а другая прайграла вайну с Сэрбіей і як бачым дастаецца ей і ад Расеі.

Калі вайна кончыцца і ў чыю карысць—трудна згадаць. Адно толькі ведаем, што кожная з ваюючых дзэржаваў, пачынаючы вайну, рабіла цьвёрдае пастанаўленьне не пакідаць аружжа, пакуль не зваюе свайго праціўніка. Але як-ні-як нехта-ж ды будзе зваеваным.

# ВАЙНА.

**Расейска-Аўстрыяцкая.**

18 жніўня. на паўдзённым фронце варшаўскаго ваеннаго округу прадаўжаліся заўзятые бітвы. На усім фронце усе атакі аўстрыякой атбіты расейцамі. Непрыяцель пакінуў тры гарматы, дзесяць пулемётоў і больш тысячы палонных. Страты аўстрыякоў вялікіе. Арміі перэбраўшыся у Галіччыну, пасовываюцца з добрым скуткам к Львову. Праціўнік атступае. Захоплено расейцамі некольки гарматоў, пулемёты і яшчыкі з набоямі. Посьціг трывае. Асабліва заўзятые бітвы адбываліся за панаваньне над рэчкай Гнілая Ліпа. Ня гледзючы на тое, што з усіх бакоў перэвага была на старане айстрыякаў, пызыція гэта была здабыта расейскім войскам. Проба аўстрыякоў стрымаць расейцоў ад стараны Галіча не ўдалася. І тут расейцы аткінулі аўстрыякоў з вялікімі стратамі для апошніх. На полі бітвы пахавана 4800 аўстрыяцкіх трупаў. У гэтай бітве расейцы узялі у палон аднаго генерала, шмат палонных, 32 гарматы, адно знамя і інш.

Пасьле семідзённай заўзятай бітвы расейская армія заўладала пярэднімі сільна умацаванымі пазыціямі Львова на 15 – 20 вёрст на ўсход ад гораду. Пасьля вельмі заўзятай бітвы 19 жніўня, аўстрыякі сталі ў безпарадку уцекаць, пакідаючы багатую ваенную здабычу і шмат забітых, раненых і палонных. Гэта армія аўстрыяцкая, зложэная с трох з лішнім корпусоў саўсім разбіта. Каля Гнілой Ліпы ўзята расейцамі ешчэ 31 гарматы. Агульная лічба здабытых гарматоў у Львоўскім напрамку каля 150.

19 жніўня непрыяцельскіе сілы масьціліся перэрваць наш цэнтр між Люблінам і Холмам, але не ўдалося. Напіраные расейцамі астаткі аўстрыяцкіх атрадоў пасьпешна атступаюць на паўдня, пакінуўшы знамя, 8 пулемётоў і больш 1000 палонных.

20 жніўня армія генерала Рузскаго узяла Львоў, а армія Брусілова—Галіч. У Львове папала у рукі расейцоў вялікая ваенная здабыча.

Левае крыло арміі расейскай стала наступаць на аўстрыякоў с 4 жніўня, і па 21 жніўня прайшло 220 вёрст находзючыся у непрарыўнай бітве с праціўніком.

22 жніўня Паміж Віслаю і Бугам, пачаўся пераход у агульнае наступаньне расейскаго войска на аўстрыякоў. Адбываліся заўзятые бітвы Моцнае сапраціўленьне аўстрыякоў расейцы скрышылі і ўзялі вялікую здабычу.

. На ўсім фронце крывавые бітвы. Расейцы пасунуліся, наперад. Каля Красностава акружаны і здаўся 45 аўстрыяцкі поўк у саставе камандзіра, 44 афіцэроў і 1600 салдатоў. Занят расейцамі Стрый. Расейская конніца—на перэвалах Карпацкіх гор.

23 жніўня. На Люблінскім і Холмскім напрамках заўзятые бітвы. Расейцы узялі 5000 у палон.

**Расейска Нямецкая.**

На ўсходней Пруссіі у Растэнбургу і Россэлю мейсцовые жыхары абстрэлівалі расейскую конніцу. На жыхароў за гэта наложэна контрыбуція.

Расейская конніца сачыла непрыяцеля каля Альленштэйна, занятаго цяперака нямецкім войскам. Мост каля Тапіау немцы спалілі.

23 жніўня. Нямецкі закаваны у броню поезд, прыехаўшый да Александрова, сіліўся бамбардаваць Влоцлавэк, але быў атпёрты праз наша войска.

Агулам паміж расейцамі і немцамі за апошні час адбываюцца толькі дробные стычкі. З заходняго тэатру вайны (французка-нямецкаго) немцы перавозюць часьці свайго войска на Ўсходнюю Прусію.

**Французка-Нямецкая.**

20 жніўня. Агульнае палажэньне мала-што змянілося. На левым крыле немцы пасунуліся на перад. У цэнтры—без перамен. У Лётарынгіі французы біліся с такой-сякой карысьцю для сябе.

21. С прычыны трываючаго абходнаго руху нямецкай арміі, левае крыло французкаго войска змушэна атступіць на паўдзённа-ўсходнюю старану. У цэнтры і на правым крыле па лініі Вавр-Лётарынгія—Вогэзы палажэньне без перамены.

22. Сярэдняе і правае крыло французкай арміі пачалі агульнае наступаньне на цэлым фронце. На левым крыле ідзе заядлая бітва; немцы сільня напіраюць. Бітвой са стараны немцоў камандуе сам цар Вільгэльм. Немцы стараюцца зламаць цэнтр і левае крыло французкай арміі, каб ачысьціць сабе дарогу к Парыжы, сталіцы Франціі.

24. Спадзяюцца большых бітваў каля Парыжу, 21 жніўня выехаў прэзыдэнт і увесь урад французкі с аталіцы у горад Бордо. Так сама выежджае с Парыжу шмат жыхароў. Кругом горада ладзюць украпленьня. Спадзяюцца, што немцы, разьбіўшы французкае войска, будуць здабываць Парыж.

**Бэльгійска Нямецкая.**

18 жніўня пачалося бомбардаваньне немцамі Антвэрпэна, апошняго мейсца схоўкі у Бэльгіі бэльгійскаго караля, ураду і часьці войска Нямецкая артылерыя акружыла крэпасьць шчыльным ланцугом з усіх старон і аткрыла забіяцкую гарматнюю стрэляніну с цяжкіх гарматоў. Газэты нямецкіе паведамляюць, што кароль бэльгійскі с сваей сямьёй хацеў выехаць с крэпасьці у Англію, але гэта яму не удалося. На днях караля лёгка раніла разарваўшаяся нямецкая граната.

У Бэльгіі немцы заводзюць свае парадкі. Усе бэльгійскіе установы грамадзянскіе і гасударственные знаходзюцца пад іх кантролем. Гаспадарацьва ўсей Бэльгіі, апрача Антвэрпэну, як у сябе дома.

**Японска-Нямецкая.**

Паведамляюць, што палажэньне немцоў у Ціндао (Кіао-Чао) вельмі кепскае. Саўсім адрэзаны ад усяго сьвету і німаюць ані якіх з ім зносін, нават па тэлеграфу.

Японцы перэхапілі тэлеграму цара Вільгэльма да камэнданта крэпасьці. У тэлеграме пішэцца, каб крэпасьць трымалася хоць праз паўгоду, бо аддача Ціндао японцам больш прынесла-бы сораму цару Вільгэльму, чым аддача расейцам Бэрліна.

**Чэрнагорска Аўстрыяцкая.**

19 жніўня после крывавай бітвы чэрнагорцы пабілі пры Вучыдоле аўстрыякоў і змусілі іх атступіць у старану Білецы.

23 жніўня чэрнагорцы разбілі аўстрыякоў каля Боляніча ў Герцоговіне і захапілі ваенную зда-

